06.05.2024 / 15:59

Стала вядомая асоба яшчэ аднаго беларускага наёмніка: 28-гадовы Арцём напісаў на сябе ў КДБ

У злітай базе зваротаў КДБ знайшлося паведамленне ад Арцёма Данчанкі з горада Белаазёрск. Да хлопца дайшлі чуткі, што КДБ цікавіцца ягоным удзелам у вайне на баку Расіі. Таму Данчанка выявіў гатоўнасць адказаць на пытанні лукашэнкаўскіх спецслужбаў па месенджары.

«Наша Ніва» праверыла асобу Данчанку. Аказалася, такі персанаж сапраўды існуе, і ён сапраўды ваюе.



Данчанка нарадзіўся ў 1996 годзе. Мама, па інфармацыі з баз Белпол, — санітарка ў мясцовым наркалагічным дыспансеры, — выхоўвала сына адна. Бацька памёр. Зорак хлопец не хапаў,

працаваў электрамантажнікам на Жабінкаўскім цукровым заводзе, потым у прыватнай арганізацыі па той жа спецыяльнасці.

Што прывяло хлопца ў шэрагі акупацыйнай арміі? Мы спыталі ў яго наўпрост і атрымалі ўзорна шаблонны адказ, убіты ў галовы кісялёўскай прапагандай: «Вырашыў, што паеду, у 2014-м годзе. Калі не змог глядзець, як забіваюць мірных людзей», — сказаў Данчанка. Ён не ўдакладніў, з якога года знаходзіцца на часова акупаваных тэрыторыях.

Хлопец напісаў, што «яшчэ ваюе, але моцна задаўбаўся», а таксама што расчараваны ў камандным складзе: «ваююць як у 1941-м».

Данчанка марыць «давесці справу да перамогі», разумеючы пад гэтым дзяржаўную граніцу па Дняпры.

На філасофскае пытанне, пра што Арцём будзе думаць у свае апошнія хвіліны, сказаў, што будзе шкадаваць толькі пра тое, што мала часу правёў з сям'ёй.

Як ён робіць лепш Беларусі, узяўшы ў рукі зброю і пайшоўшы забіваць украінцаў, Данчанка тлумачыць так:

«Лепш для дзяржавы — не азначае лепш для народа. Інтарэсы народа не заўсёды супадаюць з інтарэсамі дзяржавы.

Трэба, каб у дзяржавы была канкрэтная ідэалогія, каб народ разумеў курс дзяржавы і мог карэктаваць свае погляды. Тады хаця б будзе ясна, куды рухацца і як паляпшаць дабрабыт народа: чым лепш народу, тым лепш дзяржаве. А караблю без мэты ніякі вецер не спадарожны», — сказаў ён.

Пра крымінальную справу ў дачыненні Данчанкі пакуль нічога не вядома.

Nashaniva.com

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

Ціханоўская сустрэлася з кіраўніком НАТА

«Магчыма, гэта проста збой сістэмы». У Каменнай Горцы жыхары раёна перамаглі камунальнікаў у пяцігадовай барацьбе

Польскі суддзя, які з'ехаў у Беларусь, пакуль не падаваў прашэнне аб прытулку

Пасля гастрафэсту ў Брэсце атруціліся 19 чалавек